*О.С. Гатэлюк, А.А. Дударава*
БДЭУ (Мінск)

# РОЛЯ КАНСТЫТУЦЫІ 3 МАЯ 1791 г. У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КАНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗМУ

Гісторыя беларускага канстытуцыяналізму, як адзначаюць адмыслоўцы, пачынаецца з Прывілея Вялікага князя літоўскага і Караля польскага Казіміра 1447 г. Большасць артыкулаў Статутаў Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг. таксама насіла канстытуцыйны характар. Але першай сапраўднай Канстытуцыяй у беларускай гісторыі была Канстытуцыя Рэчы Паспалітай.

Канстытуцыя, прынятая 3 мая 1791 г., складалася з 11 артыкулаў. Першы тычыўся рэлігіі, тры наступныя вызначалі стан шляхецтва, мяшчанства і сялянства, астатнія — месца і ўзаемнае размежаванне заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады. Згодна з ёю адмяняліся «ліберум вета», выбары караля шляхтай і абавязковасць соймікавых «інструкцый» для паслоў, уводзілася спадчынная манархія, у якой выканаўчая ўлада перадавалася каралю і ўраду, падпарадкаванаму Сойму. Канстытуцыя 3 мая абвясціла таксама, што бярэ сялянства «пад апякунства ўрада», даючы надзею на паляпшэнне яго долі.

Аб'ектыўна Канстытуцыя 3 мая 1791 г. спрыяла развіццю краіны ў прагрэсіўным буржуазным напрамку. Прыняцце Соймам Канстытуцыі 1791 г. выклікала станоўчую рэакцыю ў Францыі, Англіі. Спагадліва трымалі сябе ў дачыненні да яе Прусія і Аўстрыя. Рымскі Папа асобым указам (breve) перанёс святкаванне Дня Св. Станіслава з 8 на 3 мая. Толькі ў Пецярбургу былі раздражнёныя такім аднаўленнем самастойнасці і чакалі заканчэння вайны з Турцыяй, каб пачаць вайсковыя дзеянні супраць Рэчы Паспалітай.

Канстытуцыя 1791 г. зрабіла рашучы крок да ўтварэння цэнтралізаванай дзяржавы (адзінае войска, адзіны скарб і г.д.). У Канстытуцыі 3 мая 1791 г. няма агульнаўжыванага дагэтуль выразу «Рэч Паспалітая Абодвух Народаў». Няма ў ёй і «Рэчы Паспалітае» у сэнсе сувязі абедзвюх дзяржаваў, з чым мы сутыкаемся яшчэ ва ўхваленым 18 красавіка 1791 г. законе «Месты нашыя каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітае». Дзяржава ў Канстытуцыі называецца словамі «Айчына», «Польшча», а станы, сканфедэраваныя ў Сойме, паводле яе прэамбулы, — гэта прадстаўнікі «народа польскага». Пра Літву і літвінаў у тэксце няма гаворкі, калі не лічыць згадак пра Вялікае княства Літоўскае ў тытуле манарха і подпісу маршалка літоўскай канфедэрацыі. Тым не менш 20 кастрычніка 1791 г. па настаянні ліцвінскіх паслоў адбылося прыняцце Соймам спецыяльнага дакумента «Узаемнага заручэння» Вялікага княства Літоўскага і Польшчы. У ім агаворваліся ўмовы раўнапраўнага ўдзелу прадстаўнікоў княства разам з паля-

камі ў кіраванні краінай, што падкрэслівала федэратыўны характар дзяржавы.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. была другім у свеце канстытуцыйным законам пасля Канстытуцыі ЗША 1787 г. і першым у Еўропе.

Прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г., нягледзячы на яе абмежаваны характар, было ўсё ж прагрэсіўнай з'явай у жыцці Рэчы Паспалітай, бо садзейнічала ліквідацыі фэадальнай анархіі, некалькі абмяжоўвала самаўпраўнасць і магутнасць магнатаў, прызнавала ў якасці грамадска-сацыяльнай сілы буржуазію.

Неабходна адзначыць, што Канстытуцыя не была да канца распрацаваная. Дакумент, прыняты 3 мая 1791 г., павінен быў стаць пачаткам вялікай заканадаўчай працы. Нават у тэксце Канстытуцыі ёсць спасылкі на неабходнасць яе дапрацоўкі. Адзін з «айцоў» Канстытуцыі, Гуга Каланта, 5 траўня абвясціў аб працы над эканамічнай канстытуцыяй, якая павінна была дапоўніць Канстытуцыю 3 мая 1791 г., але падзеі наступных дзён не дазволілі завяршыць гэту працу.

***А.С. Герасимович***

Академия управления при Президенте Республики Беларусь (Минск)

## КОНСТИТУЦИОННОЕ ЗАКРЕПЛЕНИЕ ПРАВ РЕБЕНКА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Очевидно, что личность человека формируется с детства. Между тем положение с правовой защитой детей во многих странах катастрофическое. По данным ООН, в настоящее время около 100 млн детей существуют за счет воровства, проституции и нищенства, более 50 млн ежегодно умирают от болезней, около 1 млн ежегодно остаются без семьи, 120 млн детей в возрасте от 6 до 11 лет не ходят в школу.

Республика Беларусь как демократическое социальное правовое государство утверждает своей важнейшей политической, социальной и экономической задачей всестороннюю защиту государством и обществом детства, материнства нынешнего и будущих поколений.

Правовую основу регулирования прав ребенка в Республике Беларусь составляют: в первую очередь Конвенция о правах ребенка, принятая резолюцией 44/25 Генеральной Ассамблеи от 20 ноября 1989 г.; Конституция Республики Беларусь 1994 г. (с изм. и доп., принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.); Закон Республики Беларусь «О правах ребенка», принятый в 1993 г. в соответствии с Конвенцией о правах ребенка 1989 г.; иные нормативные правовые акты Республики Беларусь.

На наш взгляд, в сфере регулирования прав ребенка особую роль играет Конституция как Основной Закон нашего государства. Так, в



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by